

Полацкі княжацкі храм. Рэканструкцыя П. А. Рапапорта.



Полацкі княжацкі храм. План.

**ПОЛАЦКІ КНЯЖАЦКІ ХРАМ.** Існаваў у 12—16 ст. Пабудаваны на Верхнім замку Полацка. Рэшткі выяўлены ў час археал. раскопак 1966—67.

Храм мураваны 3-нефавы, 6-стаўповы, крыжовакупальны (24×16 м), 3-апсідны (бакавыя апсіды размяшчаліся ў тоўшчы сцяны). Цэнтр. неф з У завяршаўся паўкруглай апсідай, больш вузкія бакавыя нефы — паўкруглымі нішамі ў тоўшчы сцяны. У цэнтры кампазіцыі ўзвышаўся купал на круглым светлавым барабане. Да бакавых нефаў былі прыбудаваны прытворы з самастойнымі апсідамі. Багатую пластыку фасадам надавалі пілястры складанага профілю, аркатурныя паясы, дэкар. арачкі над аконнымі і дзвярнымі праёмамі, закамары. Інтэр'ер быў аздоблены фрэскамі, падлога выкладзена з паліваных керамічных плітак.

*Літ.:* Каргер М. К. К истории полоцкого зодчества XII в.— У кн.: Новое в археологии. М., 1972; Штыхов Г. В. Киев и города Полоцкой земли.— У кн.: Киев и западные земли Руси в IX—XIII в. Мн., 1982; Раппопорт П. А. Русская архитектура X—XIII вв.: Каталог памятников.— Л., 1982.— (Свод археологических источников; в. Е 1—47). *А. А. Трусаў.*

**ПОЛАЦКІ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ.** Заснаваны і адкрыты ў 1926. У Вял. Айч. вайну разрабаваны ням.-фаш. захопнікамі. Адноўлены ў 1948 як Полацкі абл. краязнаўчы музей, з 1954 П. к. м. З 1985 філіял Полацкага дзярж. гіст.-археал. запаведніка. Размяшчаецца ў будынку б. лютэранскай царквы. Мае 11 экспазіцыйных залаў (пл. экспазіцыі 1010 м$^2$), каля 21 тыс. экспанатаў асн. фонду (1986). Аддзелы: прыроды, гісторыі дасав. і сав. перыядаў. У аддзелах гісторыі: калекцыі археал. матэрыялаў (сярод іх меч 10 ст., унікальны скарб куфіцкіх сярэбраных дырхемаў 8—10 ст., каменны абразок 1-й пал. 13 ст., звон 17 ст.) і этнаграфічная, дакументы аб становішчы працоўных пры капіталізме, рэв. рух у канцы 19 — пач. 20 ст., дзейнасць Полацкай арг-цыі РСДРП, падзеі Кастр. рэвалюцыі і Грамадз. вайны, пра актыўных удзельнікаў барацьбы за Сав. ўладу ў краі, ураджэнцаў Полаччыны У. М. Азіна, А. А. Вашнёва, К. Ф. Гатоўскага, пра дзейнасць Полацкага камуніст. падполля, партыз. рух у гады Вял. Айч. вайны. Дэманструюцца асабістыя рэчы і дакументы бел. партызан і воінаў Чырв. Арміі, у т. л. Герояў Сав. Саюза У. Е. Лабанка, З. М. Тусналобавай-Марчанкі. У экспазіцыі матэрыялы пра славутых ураджэнцаў Полацка — бел. першадрукара Ф. Скарыну, пісьменніка, публіцыста Сімяона Полацкага; пісьменнікаў П. Броўку, Э. Самуйлёнка, А. Александровіча, Я. Журбу, А. Звонака, Т. Хадкевіча. Зберагаюцца творы Я. Баршчэўскага, М. В. Без-Карніловіча, А. П. Сапунова, кнігі з дарчымі надпісамі Броўкі, Хадкевіча, Е. Лось, Г. Бураўкіна, А. Савіцкага і інш. У П. к. м. на правах аддзела ўваходзіць Музей баявой славы каля Кургана Бессмяротнасці (у Полацку). *В. А. Купрыянаў.*

**ПОЛАЦКІ ЛЕТАПІС,** адзін з першых гісторыка-літаратурных твораў, напісаных на беларускіх землях. Не збярогся. Час узнікнення, аўтар, змест і характар дакладна не высветлены, вядомы па нешматлікіх прамых і ўскосных згадках у розных пісьмовых крыніцах. На думку С. М. Салаўёва, У. Ц. Пашуты, Л. В. Аляксеева і інш. вучоных асобныя ўрыўкі П. л. ёсць у *Кіеўскім летапісе,* што збярогся ў складзе *Іпацьеўскага летапі-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ